

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№41 (279) 10 — 16 кастрычніка 2002г. Наклад 11.500 экз. Кошт 300 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ
Слонім,
Зэльва,
Дзятлава,
Масты,
Ваўкавыск,
Шчучын,
Ліда,
Гродна,
Баранавічы,
іншыя гарады Беларусі,
а таксама на HTTP://gs.promedia.by

СЛОНИМЧАНКА ВСЕХ ПОКОРИЛА КРАСОТОЙ



На республиканском конкурсе моделей "Мисс-бикини-2002", который проходил в Минске, 14-летняя слонимчанка Алина Шаповалова (на снимке четвёртая слева) заняла 2-е место.

Она получила ценные призы от компании "Velcome", бутиков "Sash" и "Aksarra".

Уже год Алина занимается дефиле (основам техники ходьбы по подиуму), аэробикой в слонимском модельном агентстве "ЛеОна". Сейчас девушка готовится принять участие в ежегодном конкурсе "Міс-журавінка-2002", где главным призом является автомобиль "Фиат".

По словам представителей модельного бизнеса, у Алины Шаповаловой есть все шансы работать за рубежом в известных модельных агентствах Европы.

Ольга ШИНКЕВИЧ

Модельное агентство «ЛеОНА» объявляет набор девушек от 13 до 20 лет для занятий дефиле и аэробикой, визажом и стилем причёски. Обращаться по адресу: ул. Первомайская, 10 (дом пионеров).

Запись состоится 11 октября с 15.00 до 18.00.

НОВОСТИ

В КВАРТИРАХ СТАНЕТ ТЕПЛО

Как сообщает директор местного предприятия отопительных котельных Николай Дрозд, с 4 октября тепло поступило в дошкольные, школьные, медицинские учреждения Слонима.

"А отопительный сезон в квартирах начался 8 октября, так как температура воздуха понизилась", — сказал Николай Николаевич.

Как отметил Николай Дрозд, на сегодняшний день существует проблема с отоплением в домах по ул. Брестской и по пр-ту Независимости. Этот район отапливается от котельной Слонимской камвольно-прядильной фабрики. А там — неисправный котел. И, по словам Николай Николаевича, его ремонт затянется до 20 октября. Поэтому в некоторых домах в районе газопровода будет либо горячая вода в кранах, либо отопление.

Ольга ШИНКЕВИЧ

Курсы обмена валют в г. Слониме по состоянию на 10⁰⁰ 08.10.2002г.

"Беларусбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	1865	1895
1 EURO	1800	1850
1 ZL	435	460
1 RUR	57	60

оао "Белпромстройбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	1865	1885
1 EURO	1815	1845
1 ZL	440	460
1 RUR	57,5	59,5

"Белагропромбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	1850	1880
1 EURO	1790	1820
1 RUR	57	59,5

Нацбанк РБ	
1 USD	1870
1 EURO	1831,76
1 RUR	59,03

ВЁСКА

ЗАРПЛАТУ — ЗБОЖЖАМ

У калгасе "Рассвет" Слонімскага раёна па-свойму вырашаюць праблему запазычанасці па зарплаце.

Зарплата за адзін месяц выдаецца збожжам па кошту 100 рублёў за кілаграм. Такім чынам, калі заробак механізатара ці жывёлавода склаў, напрыклад, 100 тысяч рублёў, чалавек атрымлівае ў калгасе адну тону збожжа. Паколькі бульба сёлета не ўрадзіла, а ўраджай збожжавых у "Рассвете" сабралі добры, то такая форма разліку прыйшлася даспадобы многім – будзе чым карміць хатнюю жывёлу. Аднак, у любым выпадку, грошы людзям таксама патрэбны. Таму былі і такія, хто свой заробак адразу прадаваў аднавяскоўцам ці суседзям з калгаса "Міжэвічы", дзе людзям за летнія месяцы не заплацілі ні збожжам, ні грашыма.

Нагадаем, што па статыстычных дадзеных на 20 верасня сельгаспрадпрыемствы Слонімшчыны завінаваціліся перад сваімі працаўнікамі на 584 мільёны рублёў. У многіх гаспадарках вяскоўцы не атрымлівалі заробак больш як па тры месяцы, і праблема гэта застаецца адкрытай.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

АЎТАМАБІЛІ РАБУЮЦЬ ПА-РОЗНАМУ:

на возеры...

Няўдала прайшла нядаўна рыбалка на Бяздонным возеры для кампаніі слонімскіх аматараў адпачыць з вудай.

Пакуль мужчыны з лодак вудзілі рыбу, нехта на беразе "звудзіў" магнітолу з аўтамабіля, на якім яны прыехалі на рыбалку.

на памежным пераходзе...

Яшчэ аднаму слонімцу не пашчасціла на памежным пераходзе "Берасгавіца". Уладальнік аўто зусім ненадоўга пакінуў свой аўтамабіль адкрытым, але гэтага часу хапіла для злодзея, які ўкраў з машыны дакументы яе ўладальніка. Так у аўтамабіліста сарвалася паездка ў суседнюю Польшчу, а міліцыянерам дабавілася працы.

на вуліцы...

Каштоўных рэчаў на суму больш як 200 тысяч рублёў не далічыўся ўладальнік мікрааўтобуса, калі пакінуў свой транспарт адкрытым і без нагляду ў Жыровіцкім завулку ў Слоніме.

Па ўсіх гэтых аўтамабільных рабаўніцтвах праводзяцца пошукавыя работы. Але, як паказвае практыка, не заўсёды ўкрадзеныя рэчы вяртаюцца да сваіх гаспадароў. Таму аўтамабілістам, якія спадзяюцца на "авось", пакідаючы рэчы ў не закрытых аўтамабілях, варта памятаць, што беражонага і Бог беражэ.

ПАКАТАЛІСЯ...

Пятага кастрычніка ў Слоніме са стаянкі, што каля магазіна №16 на Брэсцкай вуліцы, 21-гадовы мясцовы жыхар угнаў матацыкл "Ява-350", на якім яго ўладальнік прыехаў за пакупкамі.

Праўда, паездзіў угоншчык на чужой тэхніцы нядоўга, бо хутка быў затрыманы работнікамі міліцыі. У сваё апраўданне малады чалавек сказаў, што проста ўзяў матацыкл пакатацца.

Цяпер работнікі праваларадку тлумачаць аматару чужых матацыклаў розніцу паміж словамі "пакатацца" і "угон".

А вось жыхарцы вёскі Жыровічы, якая на мінулым тыдні пакінула каля мясцовай крамы свой веласіпед, не пашчасціла больш – ні злодзей, ні веласіпед пакуль не знойдзены.

Мікола КАНАНОВІЧ

СОЦЫУМ

ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ БАСТУЮЦЬ, АЛЕ НЕ ЎСЕ



5.10.02. Раздача хлеба штрэйкбрэхерам на слонімскім рынку

Агульнанацыянальная забастоўка прадпрымальнікаў Беларусі, якая пачалася 1 кастрычніка бягучага года, не абышла і Слонім.

Пуста было на Слонімскім цэнтральным рынку ў першы дзень забастоўкі, не выйшла на свае працоўныя месцы большасць прадпрымальнікаў і ў наступныя дні. Такім чынам, слонімскія гандляры далучыліся да шэрагу эканамічных патрабаванняў да ўладаў, якія былі падрыхтаваны стачкамам прадпрымальнікаў рэспублікі. Асноўная мэта забастоўкі – знізіць фінансавы прэсінг на прадпрымальнікаў з боку дзяржаўных і ўладных структураў. Як сказаў мясцовы прадпрымальнік Мікалай Яшкоў, падаткавае заканадаўства павінна быць стабільным, а тое што сёння ім прапануюць у абавязковым парадку ўсю выручку здаваць у банк ды яшчэ таму ж банку плаціць 5% за аперацыю (у выпадку адмовы здаваць грошы ў банк – штраф ад 50 да 100 базавых адзінак) – не лепшы з боку дзяржавы спосаб здабывання грошай. Увогуле, прадпрымальнікі вылучылі каля 20 асноўных патрабаванняў да ўладаў, у асноўным, эканамічнага характару. Але на гэты раз прагучалі і палітычныя патрабаванні – датэрміновая адстаўка Аляксандра Лукашэнкі з пасады прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Якіх вынікаў дасягнуць прадпрымальнікі гэтай трэцяй па ліку за гісторыю суверэннай Беларусі агульнанацыянальнай акцыяй – пакажа час. А пакуль рынкі не працуюць, то падаткі і іншыя плацяжы ад прадпрымальнікаў у бюджэт не паступаюць. Дарэчы, штомесяц прадпрымальнікі краіны выплочваюць у бюджэт каля 20 мільёнаў долараў у выглядзе падаткаў і іншых розных адлічэнняў.

На слонімскім рынку не ўсе гандляры на мінулым тыдні баставалі. Як звычайна, прадавалася садавіна і агародніна, мясныя і рыбныя прадукты, малако і малочныя вырабы, цукеркі, кандытарскія вырабы, крупы, макароны і іншыя прадукты харчавання. Таксама працавалі палаткі, дзе прадаюць пральны парашок, мыла, шампуні і т.п. Гандляры, якія не далучыліся да бастуючых, тлумачылі гэта тым, што, маўляў, выжывае мацнейшы, і ім патрэбна карміць свае сем'і. Для тых, хто выйшаў з таварам на рынак, іх калегі па гандлёваму цэху ў пятніцу і суботу бясплатна раздавалі хлеб.

"Вы нас не падтрымліваеце, бо вам не хапае на хлеб? То вось вам хлеб, трымайце!" – так пракаменціраваў сэнс гэтай акцыі для штрэйкбрэхераў адзін са слонімскіх прадпрымальнікаў Мікалай .

А калі меркаваць, што ў пятніцу было раздадзена 20 буханак, а ў суботу ў два разы больш, то атрымліваецца, што хлеб штрэйкбрэхерам спадабаўся.

Мікола КАНАНОВІЧ

НОВИНКА

ВКУСНЫЕ И ПОЛЕЗНЫЕ ®

Сегодня, чтобы предприятию выжить, не обойтись без выпуска конкурентноспособной продукции, как в качественном, так и в ценовом отношении. Это хорошо понимают на Слонимском хлебозаводе.

Поэтому здесь постоянно стараются обновлять ассортимент хлебобулочной продукции. В последнее время хлебозавод представил потребителю ряд новых изделий, из которых наибольшим спросом пользуются: булка сдобная "Троица" – выполненная в виде трех соединенных булочек, посыпанных маком, арахисом и драже "Нонпарель". А также булочка "Кокосовая пышка" с посыпкой кокосовой стружкой, "Дольки с ванилином" в упаковке, очень вкусные с горячим душистым чаем, витушка "Святочная", булка "Коса". Отдельно стоит выделить сайки яичные формовые, которые, благодаря специальной рецептуре, замесу и выпечке на новой немецкой технологической линии, имеют неповторимый вкус, цвет, запах и питательность настоящего белого хлеба, столь знакомого нам с детства.

А из планируемого выпуска новой продукции хотелось бы отметить булку "Кукурузную" с применением кукурузной смеси и булочку "Солнышко" с использованием зерновой смеси с семенами подсолнечника. Благодаря добавлению смеси, изделия существенно обогащаются витаминами и минеральными веществами, что так необходимо нашему организму. Кроме того, в состав булочки "Солнышко" входят темный солодовый экстракт и посыпка из ценных льняных семян, кунжута, овсяных хлопьев и семян подсолнечника. Имеющие привлекательную форму и компактный внешний вид эти изделия великолепно подходят для бутербродов как горячих, так и холодных. Примечательно, что в рецептуру булочек входит уникальная сухая клейковина "Фортуна", что способствует увеличению пышности и сроку хранения до 36 часов. Стоит добавить, что в процессе производства используется отфильтрованная вода и йодированная соль.

Всю вышеперечисленную продукцию вы сможете приобрести сейчас или в скором будущем в фирменных магазинах Слонимского хлебозавода, а также и во всех продуктовых магазинах Слонима.

Татьяна ХОБОТОВА, начальник лаборатории Слонимского хлебозавода

АКЦИЯ ВЛАСТИ

ПОДАЙТЕ НА ХРАМ КУЛЬТУРЫ

На прошлой неделе на телеканале ОНТ стартовал телемарафон "Построим библиотеку вместе". Журналисты "Наших новостей" вышли на центральные улицы областных городов Беларуси со специальными копилками для сбора средств.

Между тем, сумма, в которую обойдется строительство нового здания Национальной библиотеки, до сих пор неизвестна. Проектная смета будет готова только через месяц. Не объявлен и тендер для подрядных организаций, которые будут вести строительство.

Авторы проекта утверждают, что пожертвования на строительство нового здания Национальной библиотеки Республики Беларусь должны быть исключительно добровольными. Тем не менее, как показывает практика, добровольное пожертвование зачастую переходит в принудительное.

В "ГС" позвонила жительница Слонима. Женщина расплакалась, рассказывая следующее: "Мой муж работает в Слонимском сельскохозяйственном лицее (ССПЛ). Зарплата у него маленькая. И, чтобы получить хоть этот мизер, ему нужно было сначала расписаться в ведомости, что он отдает свою однодневную заработную плату (6 тысяч рублей) на строительство библиотеки. Бухгалтера не отдавали зарплату, пока люди не расписывались в ведомости о "добровольном" пожертвовании денег на строительство библиотеки. Нашей семье и так не хватает зарплаты мужа, у нас двое детей. А тут еще и библиотека...".

Председатель профкома ССПЛ Юрий Дорофейчик объяснил корреспондентам "ГС", что накануне марафона в лицее было проведено собрание педагогов, на котором и было решено, какую сумму все будут "жертвовать" на строительство библиотеки. И, по словам Юрия Иосифовича, все присутствующие согласились добровольно отдать одну свою дневную заработную плату на правое дело.

Ну, а тех (как у нас обычно бывает), кто не присутствовал на собрании, предупредили о "добровольном" отчислении денег прямо в бухгалтерии. Естественно, возмущению людей не было предела. Многие, по словам очевидцев, уходили, так и не получив свою зарплату. "Представляете, – рассказывала корреспондентам "ГС" женщина, работающая в лицее, не захотевшая назвать свою фамилию, – я, например, соберусь строить дом и начну у всех клянчить деньги. Это же абсурд".

А в это время журналисты Общенационального канала почти через каждые пять минут объявляли про ошеломляющие результаты "добровольных" пожертвований на строительство "храма культуры". И еще при этом удивлялись, мол, какой все-таки у нас народ отзывчивый!

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЗДАРЭННЕ

РАЗБІЛІ ШКЛО І ТОЛЬКІ

У вёсцы Загрыцькава Слонімскага раёна на мінулым тыдні невядомыя разбілі наччу шкло ў мясцовай краме.

Якімі матывамі пры гэтым кіраваліся хуліганы, невядома.

Бо спробы пранікнуць у памяшканне і крадзяжу не было.

Мікола КАНАНОВІЧ

МНЕНИЕ

НЕ ПРИВЫКАЙТЕ К ХАМСТВУ

Ольга ШИНКЕВИЧ

Никто из нас, к сожалению, не застрахован от хамства, с которым мы все чаще в последнее время сталкиваемся.

То в магазине нагрубят, когда ты стараешься в вежливой форме указать продавцу на то, что сдачу нужно давать правильно, а не как получится; то в автобусе с самого утра испортят настроение глупые шутки ребят, едущих в профессионально-техническое училище; то в справочной "вежливо" ответят на вашу просьбу посмотреть нужный номер телефона... И так изо дня в день.

На подобного рода хамство у некоторых, я бы даже сказала у большинства, уже выработался иммунитет. Люди зачастую стараются не обращать внимания на то, что раздражает слух и нервы. Однако некоторые случаи "вежливого" отношения друг к другу иногда просто выбивают из колеи, надолго оставляя неприятный осадок на душе.

И вот, как говорится, из последнего... Об обслуживании в слонимских ресторанах. Не так давно мы с коллегами обедали в ресторане 1-ой категории "Щара". Я, конечно, понимаю, что всем клиентам трудно угодить и улыбаться людям за весь день надоедает. Поэтому никаких претензий по этому поводу у меня нет, мол, жизнь у нас такая, невеселая, чтобы улыбаться. Но вот грубость со стороны обслуживающего персонала в тот день меня просто поразила. На столе, за которым мы обедали, накопились пустые тарелки, поэтому моя коллега из Баранович вежливо попросила официантку убрать хотя бы одну тарелку, которая стояла возле нее. На что миловидная девушка-официантка, вовсе не соответствующим ее внешнему облику тоном, ответила: "А что, мешает?"... Тут, как говорится, без комментариев. Аппетит прошел сразу же. По-моему, клиентов в такого рода заведения нужно привлекать хорошим обслуживанием, а не отталкивать своей грубостью.

И я уже не говорю о том, что кофе вам подадут, не спросив, пьете вы его с сахаром или нет, да и вилку после салата лучше придержать возле себя, так как никто не собирается приносить вам чистую ко второму блюду. И уж тем более никто не собирается учитывать ваше мнение, включая магнитофон с попсовой или блатной музыкой. Что и говорить, далеко нам еще до европейских стран, где уже давно претворен в жизнь лозунг: "Желание клиента – закон".

Не думаю, что после такого обеда в ресторане "Щара" у меня появится желание посетить это заведение снова. К сожалению, а может быть, к счастью, у меня еще не выработался иммунитет на хамство.



ОБСЛУЖИВАНИЕ В РЕСТОРАНАХ


В предприятиях общественного питания имеется 6 оценочных категорий: 3-я, 2-я, 1-я, высшая, люкс и суперлюкс.

Ресторан – это предприятие общественного питания, которое отличается лучшим оснащением, сервировкой, интерьером, более широким ассортиментом блюд сложного приготовления и высоким уровнем обслуживания. Обслуживание в ресторанах должно сочетаться с организацией отдыха и развлечением посетителей. Приготовление блюд и обслуживание посетителей осуществляется высококвалифицированными поварами и официантами. Ресторан должен иметь художественное оформление, фирменные обложки меню. **Обслуживание должно производиться официантами, которые в совершенстве знают правила и технику обслуживания.**

УСПАМІН

ЯК УСТАНАЎЛІВАЛІ ТАНК

Трыццаць тры гады назад у Слоніме быў пастаўлены помнік вызваліцелям Слоніма ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — танк Т-34.



Танк у цэнтры Слоніма

Фота Віталя ГІЛЯ

Жыхар Слоніма Анатоль Міхайлавіч Лебедзеў добра памятае той год, а гэта быў 1969-ты, калі ваенная машына з'явілася ў цэтры нашага горада. Вось, што ён расказаў карэспандэнту "ГС":

— Кіраваў устаноўкай танка на п'едэстал тагачасны старшыня Слонімскага гарвыканкама Васіль Іванавіч Пеляніцын. Я працаваў непасрэдна на ўзвядзенні фундамента. У той час быў дэфіцыт цэменту, таму Васіль Іванавіч ездзіў у Рось, дзе змог дастаць на п'едэстал 14 тон хуткадзейнага цэменту (БТЦ). Гэты цэмент мае стогадовую гарантыю. За суткі мы адлілі фундамент, на які і ўстанавілі танк Т-34. А танк бралі ў вайсковай часці, якая месцілася на Лабазоўцы. Устанаўліваў яго 40-тонны пад'ёмны кран, а сам танк важыў дзесьці 30 тон.

Сяргей ЧЫГРЫН

З ЗАЛЫ СУДА

І БЕЗ ПРАЦЫ, І НЕ ЗВОЛЬНЕНЫ

Менавіта ў такім становішчы апынуўся былы намеснік начальніка ўпраўлення па капітальнаму будаўніцтву колішняга Слонімскага райвыканкама Вячаслаў Лушчык.

Шукаць выйсця з гэтага няпэўнага становішча Вячаслаў Уладзіміравіч вымушаны быў у судзе.

Гісторыя гэта напрамую звязана з сёлетняй рэарганізацыяй Слонімскага гар- і райвыканкамаў у адну структуру. Закранула зліццё двух выканкамаў лёс многіх людзей. Хтосьці быў звольнены па скарачэнню штатаў, кагосьці перавялі на іншую (часта ніжэйшую) пасаду, а некаторыя загадзя падшукалі сабе працу за сценамі "белага" дома. Ва ўсякім разе, праца па рэарганізацыі гарадской і раённай выканаўчай улады была праведзена вялікая, і ніхто ў суд па абарону сваіх правоў з былых ці цяперашніх чыноўнікаў не звяртаўся. Мабыць, абмінуў бы яго і Вячаслаў Лушчык, калі б сур'ёзна не захварэў.

16 студзеня 2002 года Вячаслаў Уладзіміравіч трапіў у бальніцу з хваробай сэрца. Лячыўся ў стацыянары сем месяцаў і выпісаўся з бальніцы з трэцяй групай інваліднасці. Медыкі далі вызначэнне, што пасля перанесенай хваробы Вячаслаў Лушчык можа працаваць на ранейшай пасадзе з умовай, што працоўны час будзе зменшаны на дзве гадзіны. Але на той момант, як Вячаслаў Уладзіміравіч выйшаў з бальніцы (17 ліпеня 2002г.), ужо не было ні арганізацыі (УКБ райвыканкама), дзе ён працаваў да шпіталізацыі, ні ягонай пасады.

Аднак быў загад за подпісам начальніка ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Івана Бабяка ад 29.03.2002г. аб пераводзе Вячаслава Лушчыка на іншую працу. Новым наймальнікам (як правапераемнік) фармальна павінна было стаць створанае ўнітарнае прадпрыемства Раённае ўпраўленне капітальнага будаўніцтва. Фармальна таму, што пасля скаргаў Вячаслава Уладзіміравіча ў міжрайпракуратуру, інспекцыю па працы і райвыканкам па прычыне нявырашанасці яго працаўладкавання, з прадстаўнікоў гэтых устаноў была створана камісія, якая і павінна была вырашыць пытанне. Паколькі першапачаткова Вячаслаў Лушчык выказаў жаданне працаваць, яму прапанавалі пасаду інжынера. Спачатку ён пагадзіўся на прапанову, але (як тлумачыў на судзе), калі пераканаўся, што такой вакантнай пасады няма, то ў той жа самы дзень змяніў рашэнне. Лушчык заявіў, што не згодзен з загадам аб пераводзе яго на іншую працу і просіць звольніць з ранейшай пасады па скарачэнню штатаў з усімі, прадугледжанымі ў такіх выпадках законам, выплатамі. Што, калі трымацца літары таго ж закона, і павінна было быць зроблена. Але не было.

Тым часам Вячаслаў Лушчык заставаўся ў "падвешаным" стане — без працы і не звольнены. Таму 19 верасня ён звярнуўся ў суд з іскавай заявай да Слонімскага райвыканкама, у якой прасіў, каб яго звольнілі з працы па скарачэнню штатаў з адпаведнымі выплатамі і кампенсацыяй маральнай шкоды ў памеры 5 мільёнаў рублёў.

> ... Тым часам Вячаслаў Лушчык заставаўся ў "падвешаным" стане — без працы і не звольнены. Таму ён звярнуўся ў суд з іскавай заявай, у якой прасіў, каб яго звольнілі з працы па скарачэнню штатаў з адпаведнымі выплатамі і кампенсацыяй маральнай шкоды ў памеры 5 мільёнаў рублёў.

У дачыненні да Лушчыка відавочным было парушэнне працоўнага заканадаўства, калі глядзець з юрыдычнага боку і, мякка кажучы, няўвага да чалавека, які патрапіў у бяду, — з маральнага. Але ў тым, што без суда не абышлося, была ўскосная віна і самога Вячаслава Уладзіміравіча. Хаця, з іншага боку, парадаксальна, што жаданне чалавека працаваць пасля хваробы якраз і стала адной з прычын судовага працэсу.

І вось тройчы канфліктуючыя бакі збіраліся ў будынку суда, каб, нарэшце, разысціся з мірам. У ходзе судовага працэсу Вячаслаў Лушчык адмовіўся ад кампенсацыі маральнай шкоды (5 млн.руб.), а адказчык, у сваю чаргу, выканаў астатнія патрабаванні — адмяніў загад аб пераводзе на іншую працу і звольніў па скарачэнню штатаў з усімі, прадугледжанымі законам, выплатамі.

Такое міравое пагадненне было дасягнута, у першую чаргу, дзякуючы намаганням работнікаў феміды. А калі б Вячаслаў Лушчык не звярнуўся ў суд, то яшчэ доўга заставаўся б і без працы, і без грошай.

Мікола КАНАНОВІЧ

ВЁСКА І ВЯСКОЎЦЫ

АФАНАСІЙ НА ПОЎДЗЕНЬ НЕ ПАЛЯЦЕЎ

У жыхаркі вёскі Бракава Слонімскага раёна Валянціны Антонаўны Мацвеевай жыве на падворку бусел, якога дзеці назвалі Афанасіем.

— Аднойчы выходжу я з хаты, — расказвае Валянціна Антонаўна, — бачу, стаіць на надворку бусел. Я яго накарміла і думала, што ён паляціць. Але, калі я прыглядзелася, то заўважыла, што ў яго паранена крыло. Так ён і застаўся жыць у мяне з курамі. Начуе ў куратніку. Куры — на вышыні, а бусел ціхенька зойдзе ў памяшканне, сядзе на салому, ды так і пераначуе. Ён не крыўдзіць курэй, і яны яго не. А кармлю Афанасія тым, чым і хатніх птушак. Купляю для бусла яшчэ і мойву. Нават меню спецыяльнае для яго склала — дзесяць рыбінак раніцай даю, дзесяць — вечарам. Каля двух месяцаў Афанасій кватаруе ў мяне. Крыло паціху зажывае.

Неяк Валянціна Антонаўна пайшла на цагельню (так называецца месца за вёскаю). За ёю хуценька пабег і Афанасій. Прыйшлі туды, а там і гняздо буслінае ёсць, і балота побач, і невялікая рачулка. "Можа і застанецца тут бусел", — падумала жанчына. І сама непрыкметна ўцякла ад яго дамоў.

А праз дзве гадзіны выходзіць з хаты на надворак і бачыць, як за плотам стаіць бусел, усунуўшы дзюбу паміж штыкетніку. "Шкада мне стала бусліка, папрасіла я ў яго прабачэння, адчыніла веснічкі і зноў упусціла на сваю сядзібу," — працягвае расказваць пра бусла Валянціна Мацвеева.



Валянціна Антонаўна Мацвеева мойваю корміць бусла Афанасія

Фота Віталя ГІЛЯ

Калі мы размаўлялі, да нас падышлі жанчыны з суседніх дамоў. "Валянціна Антонаўна — вельмі шчырая і добрая суседка. У добрай гаспадыні і бусел прыжыўся. А буслы, як вы ведаеце, прыносяць толькі шчасце", — казалі на развітанне нам вяскоўцы.

Сяргей ЧЫГРЫН

Газета Слонімская
10 — 16 кастрычніка 2002г. №41 (279)

ІНТЭРВ'Ю

Лідзія ПЯКАРСКАЯ: ЗА НАСТАЎНІКАЎ ТРЭБА СТАЯЦЬ СЦЯНОЮ...

Заслужаную настаўніцу Беларусі, выдатніка асветы СССР і Беларусі, кавалера ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Лідзію Міхайлаўну Пякарскую ў Слоніме ведаюць многія. Сорак пяць гадоў яна аддала школе. Цяпер Лідзія Міхайлаўна на заслужаным адпачынку. Нядаўна з ёю сустрэўся і пагутарыў наш карэспандэнт.



Заслужаная настаўніца Беларусі Лідзія Міхайлаўна Пякарская

— Лідзія Міхайлаўна, ці памятаеце той дзень, калі вы развіталіся са школаю? Нябось, сумна было?

— У 1993 годзе я развіталася з пасадаю дырэктара, а пасля два гады яшчэ працавала настаўніцаю. Памятаю, што развітанне было на жнівеньскай нарадзе ў РДК. Яно атрымалася вельмі ўрачыстым. Пасадзілі мяне за столікам на сцэне, далі слова, тады я ўспомніла ўсё сваё педагагічнае жыццё ў Слоніме, дзе я пачала працаваць у 1954 годзе. Дагэтуль была сельскаю настаўніцаю ў Рахавічах і Міжэвічах. Вучыла дзетак спачатку ў пятай школе, пасля ў дзесятай, затым зноў вярнулася ў пятую школу на пасаду дырэктара, а пасля дырэктарствавала ў трэцяй сярэдняй школе.

— А вы ведалі, што вас адправяць на заслужаны адпачынак?

— Ведала і вельмі хацела. Мяне не адпускаў гарадскі аддзел адукацыі, таму я пенсіянеркай адпрацавала яшчэ восем гадоў. Тым больш, што ў школе справы ішлі вельмі добра. Але я загадзя падрыхтавала сабе замену — гэта Масько Галіну Ігнацьеўну.

— І яна пасля вас стала?

— Так, яна пабыла два гады дырэктарам, а потым паехала з мужам на Віцебшчыну. Праўда, пасля вярнулася зноў у Слонім.

— Лідзія Міхайлаўна, што запомнілася са школы вам самае нялёгкае і самае светлае?

— Успамінаецца ўсяго вельмі шмат. І розныя праверкі школы, асабліва памятаецца праверка з ЦК КПСС пад кіраўніцтвам Міронава ў 1986 годзе, і праверка Бабанскага, розныя абласныя і гарадскія камісіі. Але яны з гадамі таксама забываюцца, як забываюцца тыя ідэі і парывы, звязаныя з ленінізмам і з камунізмам.

— А вы асабіста верылі тым ідэям?

— Мне асабіста тады было зразумела, што лад быў наш сапсаваны і ганебны. Хаця ў ім было шмат і станоўчага. Таму трэба было верыць тым ідэям. Лішняе не павінны былі казаць мы і дзецям.

Але такое ў памяці не застаецца, бо яно мяняецца. А святым на ўсё жыццё застаецца любоў да дзяцей, настаўнікаў і сяброў, чалавечыя адносіны да іх. Таму вельмі хочацца пажадаць усім настаўнікам, каб яны як мага больш укладвалі душэўнай цеплыні нашым дзецям, а адміністрацыі — кожнаму настаўніку.

— Вы падтрымліваеце сувязі з былымі сваімі калегамі і вучнямі?

— Абавязкова і заўсёды. Без іх я б ужо не жыла. Яны звоняць, прыязджаюць, пішуць, дапамагаюць. Побач са мной заўсёды былі добрыя і шчырыя людзі. А каб да цябе людзі ішлі — трэба і самой да іх адносіцца з усёю душою і дабром. Калі я працавала ў дзесятай школе арганізатарам, у маім падпарадкаванні было больш за 30 класных кіраўнікоў. Але мы жылі адным дыханнем, адным пачуццём. Калі трэба было што зрабіць, дык рабілі разам хутка і дружна. Неяк перад маскоўскаю праверкаю бачу, што планы выхаваўчай работы ў кабінеце напісаны ў агульных сшытках розных колераў. Я пайшла і за свае грошы купіла аднолькавыя сшыткі, і класныя кіраўнікі за ноч усё перапісалі ў гэтыя сшыткі. Чаму? Таму, што маскоўская праверка магла прычапіцца, што мы не выконваем эстэтыкі, напісаўшы планы ў рознакаляровыя сшыткі. А калі адчынілася побач трэцяя школа, са мною працаваць туды перайшлі лепшыя класныя кіраўнікі дзесятай школы. Дарэчы, яны па асабістаму жаданню перайшлі. І гэта былі выдатныя педагогі горада. Кожны ў сваім прадмеце быў асам.



Былы старшыня Гродзенскага аблвыканкама Леанід Кляцкоў гутарыць з Лідзіяй Пякарскай і Галінай Масько. 1989г. Фота з архіва Лідзіі Пякарскай



Сустрэча ў Чыкага. Марыя Ісакаўна Рапапорт і Лідзія Міхайлаўна Пякарская



На сустрэчы выпускнікоў, 1999 г. Лідзія Пякарская ў першым радзе ў цэнтры

— Лідзія Міхайлаўна, а ці ёсць такія вучні і настаўнікі, якія з вамі не жадаюць сустракацца і вітацца?

— Не, няма. Наадварот, вітаюцца ўсе. Я многіх ужо не пазнаю, але шчыра вітаюся, каб не пакрыўдзіць таго, хто са мною вітаецца першы. Мне гэта прыемна.

— Я чуў, што вы заўсёды ў школе ў час праверак заступаліся і абаранялі сваіх настаўнікаў?

— Я стаяла за іх сцяною. Мая задача была адна — не даць "утапіць" настаўніка. А ў 10-й школе перад гродзенскай праверкай я нават абараняла найдабрэйшага чалавека, дырэктара гэтай школы Віктара Сямёнавіча Парфёнава. Усяго хапала.

— Лідзія Міхайлаўна, сёння вы сочыце за тымі пераўтварэннямі, якія адбываюцца ў беларускай педагогіцы? Я маю на ўвазе 10-бальную сістэму адзнак, 5-дзёнку і г. д.

— Беларускую школу неабходна тэрмінова забяспечваць камп'ютэрамі. Гэта будучыня нашай педагогікі. Я два разы была ў сына ў Амерыцы. Адзін раз паўгода жыла там, другі раз — каля двух месяцаў. Хачу параўнаць, бо, жывучы ў ЗША, я вельмі цікавілася станам амерыканскай педагогікі. У нас пасля дзевятага класа ніхто не хоча, каб слабы вучань прыходзіў у 10 клас. Няхай лепш ідзе ў ПТВ ці яшчэ куды. Паўстае пытанне: дзе дзецца троечніку? Таму яны ў нас ушчэмлены. У Амерыцы і для двоечнікаў, і для троечнікаў — зялёнае святло для атрымання вышэйшай адукацыі. Там да 9-га класа вывучаюцца ўсе прадметы, пасля дзевятага — на выбар школьніка. Зможаш вучыць тры прадметы — вучы тры, два — дык два. З некалькіх школ ствараюцца групы прадметнікаў. Такім чынам, закончыўшы 12 класаў, амерыканскі школьнік паступае ў вышэйшую навучальную ўстанову, дзе ён можа здаваць толькі адзін прадмет, які вучыў у школе. І ўсе гады ў інстытуце вучыць толькі гэты прадмет, альбо два ці тры. І які́м слабым ён не быў бы, за ўсе гады гэты вучань будзе па сваім прадмеце добрым спецыялістам. Праўда, за вучобу трэба плаціць. Але дзяржава дае такому студэнту пазыку на 30-50 гадоў. І пасля заканчэння ВНУ, калі ты ўжо працуеш, з цябе вылічваюць належныя працэнты, каб паціху пагасіць пазыку. Многія студэнты вучацца і працуюць. Некаторыя паспяваюць нават закончыць некалькі вышэйшых устаноў. Вось табе і троечнікі. А ў нас, калі ты добра вучышся — вучыся, калі не — ідзі працуй, або швэндайся без працы. Нельга, каб так было.

Цяпер наконт шостага дня ў школе. На маю думку, трэба зрабіць так, каб у суботу і ў нядзелю дзеці ў школу не хадзілі, а знаходзіліся з бацькамі дома. Ды і настаўнікам трэба даць магчымасць пабыць у сям'і. А то атрымліваецца, як у той прымаўцы: і ў дзеўках, і замужам. За мяжою ў выхадныя школы зачынены.

Што датычыць 10-бальнай сістэмы адзнак ведаў вучняў, дык такое новаўвядзенне я толькі вітаю. Хаця ў нас усялякую навізну заўсёды прымалі ў штыкі. Памятаю, у пятай школе некалі адзін вучань стаў танцаваць шэйк. Думала, што мяне за гэта са школы выганяць. А цяпер — танцуюць усё... Ды і гэтаму вучню як мне сёння ў вочы глядзець? Ён жа ішоў у нагу з часам. Так атрымліваецца сёння і з10-бальнай сістэмай. Хаця спачатку яе трохі сапсуюць. А пасля ўсё будзе добра.

Вельмі крыўдна мне сёння і за тое, што ў дзяцей нашых забралі бясплатную шклянку гарбаткі і булачку. Грошы ідуць на вялікія будоўлі, а дзеці нашы галадаюць. У аднаго школьніка ў партфелі будзе бананчык, а другі ўжо суткі нічога не еў. Таму тыя хлопчык і дзяўчынка чакаюць перапынку, як Бога, каб нешта перакусіць. А такога перапынку ўжо няма. Крыўдна... Таму я за тое, каб была на харчаванне старшакласнікаў дзяржаўная датацыя.

— Лідзія Міхайлаўна, а ў Чыкага вы каго-небудзь з жыхароў Беларусі сустракалі?

— Сустрэч было многа. Але суткамі я гутарыла з былой слонімскай настаўніцай Марыяй Ісакаўнай Рапапорт, якая там жыве. Яна ўжо грамадзянка ЗША, атрымлівае пенсію, але вельмі сумуе па Слоніму, па Беларусі. Ратуе яе тое, што яна вядзе вельмі актыўны лад жыцця. Удзельнічае ў многіх конкурсах і гуртках. У сваім узросце яна нават была міс-прыгажуняй Чыкага. Штогод для пенсіянераў там праводзіцца такі конкурс.

— Як вы думаеце, калі было лягчэй працаваць настаўнікам: сёння ці ўчора?

— Цяпер настаўнікам быць цяжка. Напрыклад, тады, калі працавала я, ніхто не думаў пра зарплату, а больш думалі пра ідэю. А зарплату мы атрымлівалі дзень у дзень, гадзіна ў гадзіну, а сёння?.. Адсюль і ўсе праблемы. Нават крэйды ў школе няма... А прычына адна — адсутнасць грошай.

— Ці існуе цяпер у Беларусі, на вашу думку, беларуская нацыянальная школа?

— Найперш, усё павінна выкладацца ў школах на роднай беларускай мове. А гэтага ў нас няма. Зніклі і беларускамоўныя класы. Пры мне некаторыя школы нашага горада поўнасцю былі перайшлі на беларускую мову. А што робіцца цяпер на гэты конт, я не разумею. Ідзе мэтанакіраванае знішчэнне нацыянальнай школы. Нам трэба вучыцца ў суседзяў і браць з іх прыклад. Ды і не толькі ў педагогіцы, але і ва ўсім.

Сяргей ЧЫГРЫН

СЛОНІМ

КРАДУЦЬ ЗАГАДЧЫЦЫ МАГАЗІНАЎ

Загадчыца аднаго з магазінаў Слонімскага раённага спажывецкага таварыства прысвоіла сабе грашовую выручку на суму 635 тысяч рублёў.

А ў Зэльвенскім райспажыўтаварыстве загадчыца магазіна ўкрала таварна-матэрыяльных каштоўнасцей на суму 400 тысяч рублёў.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗЭЛЬВА

ЁЙ САЛА ВЕЛЬМІ ЗАХАЦЕЛАСЯ

Раней судзімая жыхарка вёскі Дзярэчын Зэльвенскага раёна залезла ў дом свайго аднавяскоўца.

Зладзейка, як яна потым патлумачыла, вельмі хацела есці і ўкрала ў суседа чатыры кілаграмы сала. Яе затрымала міліцыя.

Сяргей ЧЫГРЫН

ГРОДНА

ЛЕНІНА – НА КАЛІНОЎСКАГА

З пачатку кастрычніка ў Гродне збіраюць подпісы за дэмантаж помніка Леніну на плошчы, названай у гонар правадыра сусветнага пралетарыяту.

На ягонае месца прапануецца ўсталяваць помнік Кастусю Каліноўскаму, нацыянальнаму герою Беларусі, кіраўніку паўстання 1863 года.

Ініцыятарамі акцыі выступілі мясцовыя філіі БСДГ і Фонду імя Льва Сапегі.

Валера РУСЕЛІК

ВОЛКОВЫСК

ВОСКОВЫЕ ДЕЯТЕЛИ

В Волковысском военно-историческом музее проходила выставка под названием «Вожди и президенты», представленная музеем восковых фигур Санкт-Петербурга.

Посетители имели возможность увидеть изваяния в воске выдающихся политических деятелей минувших лет и современности.

С МИРУ ПО НИТКЕ

На площади имени Ленина состоялась благотворительная акция по сбору средств на строительство нового здания Национальной библиотеки в Минске.

А артистами волковысского районного дома культуры был организован концерт. Немногочисленные зрители, собравшиеся на данное мероприятие, не проявили особой активности по сбору средств на строительство «уникального хранилища в форме алмаза».

Большинство горожан считают, что в первую очередь надо решать насущные экономические проблемы, а затем уже культурные.

ПРОДАЛ, А ДЕНЬГИ ПРИСВОИЛ


В отношении начальника отдела снабжения и сбыта волковысского предприятия «Содружество» К. возбуждено уголовное дело.

Выясняется, что он реализовал товар на сумму 397 тысяч 140 рублей, а выручку присвоил.

Александр ДАНИЛИН

НАГОДА

ЁН З РАДЗІМЫ КАСЦЮШКІ



Фота Віталя ГІЛЯ

Яўген Бялевіч

Дваццаць шосты год працуе галоўным архітэктарам Слонімскага райвыканкама Яўген Бялевіч, якому 11 кастрычніка спаўняецца 60 гадоў з дня нараджэння.

Яўген Фёдаравіч сам па сабе вельмі своеасаблівы і цікавы чалавек. Родам ён з Івацэвіцкага раёна. Дзяцінства і школьныя гады яго прайшлі каля вядомага Косаўскага палаца — помніка архітэктуры 19 стагоддзя. А яшчэ побач з яго роднаю вёскаю знаходзіцца фальварак Мерачоўшчына, дзе нарадзіўся палітычны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай Тадэвуш Касцюшка. Сама гісторыя выхоўвала Яўгена Бялевіча ў любові да сваёй Бацькаўшчыны, да мастацтва і культуры. Таму пасля заканчэння Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута працаваць прыехаў у Слонім — бліжэй да сваіх бацькоў, да свайго роднага кутка. Тым больш, што і Косава, і Мерачоўшчына некалі адносіліся да Слонімскага павета.

Да Яўгена Бялевіча, як да чыноўніка, не часта па рабоце прыходзілася звяртацца. Але ў апошні час, калі Слонім рыхтаваўся да юбілею, было шмат пытанняў і да яго, як архітэктара раёна. Некалькі пытанняў узнікла і цяпер.

— Яўген Фёдаравіч, прабачце, калі ласка, што перад вашым асабістым юбілейным днём нараджэння, "лезу ў вочы" са сваімі пытаннямі па добраўпарадкаванню нашага горада. Тым не менш, калі закончыцца рамонт прывакзальнай плошчы і вакзала ў Слоніме?

— Як паведаміла мне Баранавіцкая дыстанцыя Беларускай чыгункі, рамонт вакзала ў Слоніме пачнецца ў наступным годзе. Да гэтага часу будзе добраўпарадкавана і прывакзальная тэрыторыя.

— Многія чытачы пытаюцца пра аб'язную дарогу вакол нашага горада.

— Ужо вядзецца праектаванне, і ў 2003 годзе павінна пачацца будаўніцтва аб'язной дарогі ад Чапялёўскага скрыжавання да дарогі Слонім-Высокае-Брэст.

— Яўген Фёдаравіч, у вольны час вы любілі маляваць, а таксама пісаць вершы. А як сёння?

— Па-ранейшаму малюю і пішу. Нядаўна я наведаў сваю маленькую радзіму. Сустрэўся з сябрамі і аднакласнікамі. Мы пабывалі каля сцен разбуранага замка ў Косаве, наведалі Мерачоўшчыну. Сустрэча атрымалася радаснай і шчырай, але адначасова сумнай. Памяці свайго школьнага сябра я прысвяціў свой верш "Настальгія". Гэта не толькі памяць пра сябра, але і настальгія па маленству, і па тых гадах, якія ўжо ніколі не вернуцца.

— Тым не менш, Яўген Фёдаравіч, дазвольце вас павіншаваць з юбілеем і пажадаць вам здароўя і творчых сіл!

Сяргей ЧЫГРЫН

НОСТАЛЬГИЯ

Памяти школьного друга

Минули юности года.
Забыть их нам дано едва ли,
Мы после школы каждый раз
С тобой на замчище бывали.
И каждый помнил, как тогда
Тех юных лет простые были,
Воздушных замков города
За горизонты нас манили.
Последний прозвучал звонок,
Вновь разбудив души тревоги,
Шагнули прямо за порог
И разошлись совсем дороги.
Уже в студенческие дни
Я вспоминаю, как бывало,
В Норильске что-то строил ты,
Я шёл по сопкам Магадана.
Вокруг дремучая тайга,
Я радуюсь мохнатым елям.
Распорядилась так судьба:
Мы шли
по разным параллелям.
Но где бы ни был я потом,
Моя прекрасная Отчизна,
Мне снился замок на плато,
Мой край родной —
Мерачовщизна.
Стою опять у стен седых,
Уж времена совсем иные,
Здесь каждый
камешек знаком,
Тех дней
вернулась ностальгия.
Со мною говорит стена,
Я замечаю первым делом
«Прощай», —
ты слово написал
И расписался ярким мелом.
И я в отчаянье уже,
Такое выпало несчастье,
Мы разошлись с тобою здесь,
Совсем недавно —
в получасье.
Быть может, я чуть опоздал.
Возможно, ты поторопился,
И я корю себя за то,
Что здесь с тобою
не простился.
Ушли прекрасные года,
Мне детских грёз
немного жалко.
И я стою давно один
У стен разрушенного замка.

Евгений БЕЛЕВИЧ

ВОЛКОВЫСК

БАСТУЮТ ПРЕДПРИНИМАТЕЛИ

С начала октября опустели торговые ряды на волковысских рынках. Непомерные налоги, введение кассовых аппаратов, негативное отношение чиновников к частному бизнесу вынудили предпринимателей объявить забастовку.

Свои требования они изложили в письмах, направленных в райисполком, межрайпрокуратуру и областной Совет народных депутатов.

ТОРГОВАЛИ ЖИВЫМ ТОВАРОМ

Возбуждено уголовное дело в отношении мужчин Ч. и Ш., которые по предварительному сговору и в корыстных целях на территории Волковысского района склонили гражданку П. к занятию проституцией на территории Польши.

После чего её переправили через границу в соседнее государство, где девушку вынуждали торговать своим телом.

Александр ДАНИЛИН

СЛОНІМ

БОЙКА Ў ВАСІЛЕВІЧАХ

Падчас бойкі на дыскатэцы ў вёсцы Васілевічы пацярпеў жыхар Гродна, які прыехаў у госці да сваякоў.

Па папярэдніх звестках, яго гуртам збілі мясцовыя хлопцы. І асабліва ў гэтым вызначыўся былы вайсковец, які нядаўна звольніўся з арміі. У выніку бойкі пацярпелы атрымаў даволі значныя цялесныя пашкоджанні.

Міліцыя па гэтаму факту праводзіць праверку.

Мікола КАНАНОВІЧ

САБАЧАТНІКІ З ПАНАСОЎКІ

На мінулым тыдні ў дом да сланімчанкі, якая жыве ў завулку Панасоўка, зайшла група мясцовых падлеткаў.

Яны сказалі, што прыйшлі, быццам бы, паглядзець сабачанят, якіх нядаўна прывяла гаспадынева сука.

Але пакуль бабуля выконвала просьбу гасцей і паказвала ім сабачанят, падлеткі знайшлі і забралі ў яе 120 тысяч рублёў.

Хто і колькі з непаўнагодкаў узяў грошай, зараз высвятляе міліцыя.

Мікола КАНАНОВІЧ

ВОЛКОВЫСК

ДОРОГА ОШИБОК НЕ ПРОЩАЕТ

На перекрёстке автодорог Барановичи — Гродно и Волковыск — Лапеница произошла авария.

Житель Волковыска, двигаясь на мопеде по второстепенной дороге, не пропустил грузовой автомобиль «Вольво» и оказался под колёсами многотонного фургона. Пострадавший мужчина с тяжелейшими травмами госпитализирован в Гродненскую больницу.

Александр ДАНИЛИН

ЗЭЛЬВА

ПАЖАРНЫЯ СПАБОРНІЧАЛІ: ХТО ЛЕПШЫ?

У Ваўкавыску адбыліся занальныя спаборніцтвы па газадымаахоўнай службе сярод аддзелаў па надзвычайных сітуацыях Гродзенскай вобласці.

Каманда Зэльвенскага раёна заняла 1-е месца і разам са Слонімскай камандай (2-е месца) выйшла ў фінал.

ВІНАВАТЫ І ДЗЕЦІ

За трэці квартал 2002 года ў Зэльвенскім раёне зарэгістраваны 15 пажараў.

Асноўнай прычынай узгарання з'яўляецца неасцярожнае абыходжанне з агнём. Але двойчы пажары адбываліся па віне дзяцей. Так дзіцячыя свавольствы з агнём прывялі да загарання стога саломы ў вёсцы Караліно. Па гэтай жа прычыне згарэў хлеў у вёсцы Дзярэчын.

Як паведамілі карэспандэнту "ГС" у Зэльвенскім раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях, за вышэйадзначаны перыяд у агні загінулі два чалавекі.

Наталля ГЛУШЭНЯ

МАСТЫ

АХВЯРАВАННІ НА БІБЛІЯТЭКУ

Працягваецца збор сродкаў на будаўніцтва нацыянальнай бібліятэкі. У некаторых калектывах кіраўнікі Мастоўскага раёна прымушаюць уносіць канкрэтныя ахвяраванні.

У шэрагу школаў раёна перад настаўнікамі была пастаўлена пэўная ўмова: на бібліятэку кожны павінен ахвяраваць па 2 тысячы рублёў.

"NOTA BENE" ЗАЦІКАВІЛАСЯ ТЭЛЕБАЧАННЕ

Мастоўскі арт-гурт "NOTA BENE" ("ЗВЯРНІ ЎВАГУ") набывае папулярнасць.

На яго звярнула ўвагу Гродзенскае тэлебачанне. З гэтай нагоды яго здымачная група завітала ў Масты і зрабіла здымкі выступлення калектыву, якія неўзабаве пабачаць там гледачы.

У ВЕЛАСІПЕДЫСТАЎ БУДЗЕ СВАЯ ДАРОГА

Урэшце вырашылася пытанне з аднаўленнем веладарожкі між горадам Масты і вёскай Правыя Масты.

На сённяшні дзень заасфальтавана больш паловы дарожкі, і хутка праца закончыцца. Супрацоўнікі ДАІ маюць намер дабіцца, каб веласіпедысты рухаліся іменна па гэтаму шляху, бо штогод на гэтым участку шашы рэгіструецца па некалькі дарожна-транспартных здарэнняў са смяротным зыходам.

АДЗНАЧЫЛІ ДЗЕНЬ НАСТАЎНІКА

Ушанаванне настаўнікаў з нагоды іх прафесійнага свята ў Мастоўскім раёне прайшло сціпла.

Напярэдадні ім выплацілі прэміі ў памеры дваццаць тысяч рублёў. Як заўжды, адбыўся святочны канцэрт у раённым доме культуры, дзе свае майстэрства паказаў народны калектыў "Ярыца". Напачатку настаўнікаў папярэдзілі, што наведванне канцэрта будзе каштаваць тысячу рублёў, але гэтыя грошы з іх пакуль не ўтрымалі, а толькі ўручылі кветкі з пазначаным коштам. На тым урачыстасці і закончыліся.

Антон МАКЕЙ

ЗЭЛЬВА

ХАТА ЗАСТАЛАСЯ БЕЗ ДАХУ

На мінулым тыдні ў вёсцы Бярэжкі, што на Зэльвеншчыне, здарыўся пажар.

У выніку ўзгарання, агонь знішчыў хлеў, дах дома і пашкодзіў гаспадарчую прыбудову грамадзянінкі П. Прычынай пажару стала неасцярожнае абыходжанне з агнём у стане алкагольнага ап'янення.

ПУСЦІЎ ЧЫРВОНАГА ПЕЎНЯ

У чацверг, 3 кастрычніка, адбылося ўзгаранне жылога дома ў вёсцы Цяглевічы Зэльвенскага раёна.

Мяркуецца, што гаспадар дома наўмысна падпаліў сваю хату.

Наталля ГЛУШЭНЯ

ДЗЯТЛАВА

СУТЫКНЕННЕ НА ЧЫГУНЦЫ

